# Сістэматызацыя ведаў па раздзеле «Лексіка і фразеалогія»

## Урок беларускай мовы ў 5 класе

**Н. І. Куратнік,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 2 г. Пінска

**Мэта:** сістэматызацыя і падагульненне ведаў, набытых па лексіцы і фразеалогіі.

**Задачы:** замацаваць уменне адрозніваць адназначныя і мнагазначныя словы, размяжоўваць прамое і пераноснае значэнне, падбіраць да слоў сінонімы, антонімы, амонімы, замацаваць веды пра агульнаўжывальную лексіку і лексіку абмежаванага ўжытку і фразеалагізмы; садзейнічаць узбагачэнню слоўнікавага запасу вучняў; развіваць навыкі аналітычнага мыслення; вучыць беражліваму стаўленню да слова.

**Тып урока:** урок падагульнення і сістэматызацыі вывучанага.

**Абсталяванне:** беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Красней В.П., Лаўрэль Я.М., Васюковіч Л.С., Несцяровіч В.І. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2014 г.; карткі з заданнямі, мультымедыйная прэзентацыя да ўрока, схема “Слоўнікавы склад мовы”.

**Эпіграф.** *Над намі словы ўладараць*. С. Грахоўскі

## Ход урока

### І. Арганізацыйна-матывацыйны этап

**Настаўнік.** Успомніце, што мы называем асноўнай адзінкай маўлення, з дапамогай якой называем усе прадметы, з’явы, паняцці. *(Слова).* Звяртаем увагу на эпіграф на дошцы. Як мы разумеем яго значэнне. Параўнаем сваю думку з выказанай ў вершы С. Грахоўскага”Словы”. Якія словы з верша мы можам узяць **у** якасці дэвіза нашага жыцця**,** узаемаадносін?

Над намі словы ўладараць,
Мы чуем і гаворым іх,
Яны то здружаць, то пасвараць
Сяброў і ворагаў маіх.
Бо словы розныя бываюць.
Адны – агню стрымаюць шквал,

Другія словы забіваюць
Усё жывое напавал.
Ад слова сэрца халадзее,
Праходзіць сон і забыццё,
Ад слова рушацца надзеі,
Ад слова свеціцца жыццё.
Ад слова вырастаюць крылы,
А ў сэрцы стукае любоў,
Ад слова прыбываюць сілы,
Дык **не шкадуйце шчырых слоў!**

**Настаўнік**. Чаму вучыць нас гэты верш? Нашы мудрыя продкі таксама здаўна падкрэслівалі вялікую сілу слова, выказаўшы свае думкі ў прыказках і прымаўках.

***Гульня "Збяры прыказку"*. Работа ў парах.**

**Умова. З** прапанаванага набору слоў сабраць прыказку пра слова, мову.

Рана загоіцца, злое слова – ніколі.

Са свайго языка спусціш – на чужым не зловіш.

Слова – не верабей, выпусціш – не зловіш.

Добрае слова даражэйшае за грошы.

**Настаўнік**. Што аб'ядноўвае гэтыя прыказкі і верш С.Грахоўскага?

**ІІ. Падагульненне вывучанага**

**Актуалізацыя ведаў**

- Як называецца раздзел мовазнаўства, што вывучае слова, яго лексічнае значэнне? Давайце ўспомнім, з якімі паняццямі мы знаёміліся ў раздзеле "Лексіка".

**Умова.** З прапанаванага на слайдзе пераліку выбраць і запісаць навуковыя тэрміны, якія вывучаліся ў гэтым раздзеле: *лексіка, словазлучэнне, сказ, лексічнае значэнне слова, галоўнае і залежнае слова, адназначныя і мнагазначныя словы, арфаграма, прамое і пераноснае значэнне слова, выказнік, устарэлыя словы, неалагізмы, дзейнік прафесійныя словы, сінонімы, антонімы, амонімы, дапаўненне, фразеалагізмы.*

**Мэтамеркаванне вучняў**

***Прадоўжыць наступныя выказванні:***

На ўроку мы паглыбім свае веды пра… .

Удасканалім уменні… .

**Настаўнік**. У жыцці ў нас ёсць памочнікі, якія дапамагаюць нам правільна выкарыстоўваць моўныя адзінкі ў сваім маўленні. Аб чым ідзе гаворка? Падказка ў наступных радках

Скарб мой несхаваны,
Скарб мой адмысловы:
Ува мне сабраны
Словы роднай мовы.
Пасябруй са мною,

Разгарні старонкі,
Надзялю багаццем
Нашай мовы звонкай.

***Увага вучняў звяртаецца на выставу слоўнікаў.***

**Настаўнік.** Перад вамі слоўнікі, якія ёсць у нашай бібліятэцы. Няхай яны стануць вашымі надзейнымі памочнікамі.

**Настаўнік.** Кожнае слова што-небудзь абазначае, гэта значыць мае лексічнае значэнне. ***Арфаграфічная хвілінка "Пазнай слова па значэнні".***
**Умова.** Запісаць слова, растлумачыць арфаграму.

1. Цыркавы артыст-комік (клоўн).
2. Буйная афрыканская птушка атрада бегуноў (страус).
3. Конны пастух у стэпах Паўночнай Амерыкі (каўбой).
4. Пышнае сцэнічнае відовішча з удзелам артыстаў эстрады, цырка (шоу).
5. Адзін з самых буйных прадстаўнікоў жывёльнага свету, якія вымерлі ў мезазойскую эру (дыназаўр).
6. Удзельнік палёту ў космас (касманаўт, астранаўт).
7. Перакладзіна для адкрывання і закрывання шляху (шлагбаум).

***Адназначныя і мнагазначныя словы.***

**Умова.** Прачытаць сказы на картках. Карыстаючыся даведкай, вызначыць значэнне слова "зямля".

Месяц – спадарожнік Зямлі.
На гарызонце маракі ўбачылі зямлю.
Родная зямелька, як зморанаму пасцелька.
Для таго, каб кветкі добра раслі, трэба рыхліць зямлю.

**Даведка**: планета, тэрыторыя, Радзіма, глеба, суша.

**(Схема "Слоўнікавы састаў мовы" (Дадатак), дапоўніць схему на дошцы.)**

**Заданне "Знайдзі пару" (Вусна).**

**Умова.** На дошцы словы запісаны ў 2 групы. Карыстаючыся схемай, скажыце, як называюцца гэтыя групы, аб'яднайце словы ў пары.

Дзяньгуб – гультай, віляхвост – падліза, патапеча – балота, жалязняк – лапата, картоплі – бульба, вобмаль – мала, саснянкі – лісічкі.

**Фізкультхвілінка.**

Настаўнік спытае – трэба ўстаць.
Калі дазволіць сесці – сядзь.
Адказаць хочаш – не шумі,
А руку акуратна падымі.

**Выкананне апераджальнага задання.** Вучні чытаюць прафесійныя словы, якія выкарыстоўваюцца ў прафесіі іх бацькоў, задача вучняў – пазнаць, пра якую прафесію ідзе гаворка.

**Настаўнік.** Пра якія словы ідзе гаворка ў наступным вершы. Якія словы называюцца ўстарэлымі?

Разбіваецца слова
аб прастору,
як пташка:
пранік, церніца, прасніца,
матавіла, барташка,
апалушкі, пярэтычкі,
дылі, білы, сявенькі…
Колькі слоў паўмірала –
Бабулек сівенькіх.

**Данута Бічэль**

**Гульня "Знайдзі пару"**

**Умова.** Да дыялектных слоў падабраць агульнаўжывальныя.

Перст – палец, іспыты – экзамены, лемантар – буквар, вакацыі – канікулы, сеча – бітва, нагалосак – націск, закавыка – коска, чало – лоб, раць – войска, ланіта – шчака.

**Настаўнік.** Як называюцца словы, якія ўзнікаюць для абазначэння новых прадметаў, паняццяў? Якія неалагізмы ўзніклі для абазначэння прадметаў, якія вы бачыце на слайдзе?

***(** айфон, дысплей, смартфон, ноўтбук, сканер)*

***Сінонімы, антонімы, амонімы.***

**Настаўнік.** Якое свята адзначалася 15 мая? Хто складае вашу сям'ю? Праца з тэкстам на картках.

**Умова.** Вызначыць тэму, аноўную думку тэксту. Выпісаць сінонімы і антонімы.

Дзядуля

Наш дзядуля сталы, пажылы чалавек. Ён вельмі разумны і мудры. Заўсёды паспагадае і паспачувае, пашкадуе. Параіць і падкажа. Растлумачыць незразумелае, цацку зробіць, змайструе, новую забаўку ці гульню пакажа. А то і паўшчувае, папракне: не дурэй, не свавольнічай! А як стане расказваць… Пра што ён толькі не апавядае! Пра жывёл, звяроў розных, пра даўнейшае і цяперашняе жыццё. Цудоўна, калі побач з намі, маладымі, наш дарагі і любімы старэнькі дзядуля.

*Якія словы адсутнічаюць у гэтым тэксце? Звяртаемся да слайда, знайдзіце пары амонімаў, якія там схаваліся.

**Рубрыка "У гасцях у слова". Пазнай фразеалагізм па апісанні.**

**На шапачны разбор.** Згодна традыцыі, мужчыны на Русі пры ўваходзе ў царкву здымалі шапкі і складвалі іх каля ўваходу, а пасля заканчэння службы забіралі. Той, хто спазніўся на богаслужэнне, прыходзіў ужо на шапачны

разбор, і з тых часоў гэты выраз замацаваўся ў значэнні “прыйсці куды-небудзь вельмі позна, калі ўжо ўсё закончылася”.

**Кракадзілавы слёзы.** Паводле старажытнага падання, перш чым з’есці сваю ахвяру кракадзіл праліваe слёзы, нібы шкадуе яе. Пазней вучоныя даказалі, што кракадзілы сапраўды могуць плакаць. Але ніяк не ад пачуцця жалю, як сцвярджалася ў старажытнасці, а ад лішкаў солей, якія назапашваюцца ў арганізме і выходзяць праз пратокі вачэй. Апавяданні аб тым, што кракадзіл праліваe слёзы аб сваёй ахвяры, паслужылі асновай для абазначэння стану людзей, якія прыкідваюцца, што крануты няшчасцем блізкіх, якім самі ж рыхтуюць бяду.

**Шыварат-навыварат.** У Маскоўскай Русі шыварaтам называўся расшыты каўнер баярскага адзення. У часы Івана Грознага баярына, які правініўся, садзілі на худую клячу спінай наперад, надзеўшы на яго адзенне навыварат. Так і вазілі па ўсяму гораду пад насмешкі вулічнага натоўпу. І зараз гэты выраз ужываецца ў значэнні задам наперад.

**Заданне “Пазнай фразеалагізм па малюнку”**

**Умова.** Вучні дэманструюць падрыхтаваныя дома малюнкі да фразеалагізмаў, аднакласнікі пазнаюць, пра які фразеалагізм ідзе гаворка, тлумачаць яго значэнне.

**III. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія**

**Выкананне тэставага задання.**

1. Словы адной і той жа часціны мовы, аднолькавыя па гучанні і напісанні, але розныя па лексічным значэнні, называюцца:

а) адназначнымі; б)мнагазначнымі; в)сінонімамі; г)амонімамі; д)антонімамі.

2. Укажыце групу слоў, у якой правільна падабраны сінонімы да слова *смеласць:*

а) адвага, храбры, мужны, гонар; б)адважны, храбры, мужны, ганарлівы; в)адвага, храбрасць, мужнасць, геройства; г) адвага, мужнасць, гонар, гераізм.

3. Выберыце з прапанаваных слоў устарэлыя:

а)кілаграм; б)тона; в) вярста; г) аршын; перст.

4. Укажыце, як называюцца выдзеленыя ў сказах словы: Дзед выбірае *касу.* Валасы заплецены ў *касу.*

а) мнагазначныя; б) сінонімы; в) амонімы; г) антонімы.

5. Выберыце з дадзеных спалучэнняў фразеалагізмы:

а)трымаць за вуха; б) трымаць вуха востра; в) пусціць туман у вочы; г) апусціўся туман; д) малоць муку; е) малоць глупства.

**Настаўнік.** Вернемся ў пачатак урока, успомнім, якія мэты ставілі, ці змаглі іх дасягнуць. Пры дапамозе прапанаваных на дошцы фразеалагізмаў вызначым, як мы іх дасягалі:

*з аганьком, з душой, абы з рук, цераз пень калоду, закасаўшы рукавы.

**IV. Дамашняе заданне.**

**Пр. 7, 8, с. 92**

**Дадатак**


Слоўнікавы састаў
(выкарыстоўваюць і разумеюць усе, хто ведае мову)
Словы абмежаванага ўжытку
(распаўсюджаны на пэўнай тэрыторыі)
(выкарыстоўваюцца ў мове людзей пэўнай прафесіі)